*Т. С. ЮХНАВЕЦ*

# ЭВАЛЮЦЫЯ КУРСА "БІБЛІЯТЭЧНЫЯ ФОНДЫ" Ў ПРАЦЭСЕ ЯГО ВЫКЛАДАННЯ

*Пераасэнсоўваюцца з пазіцый сучаснасці асноўныя этапы станаўлення і развіцця курса "Бібліятэчныя фонды" ў вучэбным працэсе ВНУ ў межах былога Савецкага Саюза, незалежных Расіі і Беларусі. Называюцца імёны навукоўцаў, якія ўнеслі значны ўклад у распрацоўку курса і фондазнаўства ўвогуле. Характарызуюцца галоўныя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па курсу, а таксама вызначаюцца праблемы яго развіцця на сучасным этапе. У выніку праведзенага даследавання робіцца вывад аб неабходнасці тэарэтычнага і практычнага ўдасканалення курса "Бібліятэчныя фонды".*

Курс "Бібліятэчныя фонды" – адна з асноўных спецыяльных дысцыплін у сістэме падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў бібліятэчнай справы нашай краіны. Яго значнасць у тым, што фонд, або сістэматызаваны збор дакументаў, у бібліятэцы адыгрывае ролю асновы, фундамента яе дзейнасці. Менавіта дакументны фонд з'яўляецца галоўным інструментам у выкананні асноўнай мэты дзейнасці бібліятэкі – задавальненні інфармацыйных патрэб карыстальнікаў. У працэсе выкладання курса вывучаюцца тэарэтычныя і практычныя пытанні фарміравання фондаў бібліятэк розных тыпаў і відаў, у тым ліку выкарыстанне аўтаматызаваных тэхналогій камплектавання і арганізацыі фонду. Павышэнне якасці і эфектыўнасці падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў немагчыма без сістэматычнай работы па ўдасканаленні выкладання курса "Бібліятэчныя фонды".

Пошук публікацый аб этапах, змесце, методыцы выкладання і перспектывах развіцця курса з яго ўзнікненнем выявіў зусім нязначную іх колькасць. Усе работы належаць знакамітым расійскім даследчыкам Ю.М.Сталярову [15; 20], В.І.Васіленка [5], У.І.Цярошыну [21], якія разглядаюць адзначаныя аспекты курса ў кантэксце былога Савецкага Саюза і незалежнай дзяржавы Расійскай Федэрацыі. Адсутнасць работ аб развіцці курса ў Беларусі не дазваляе параўнаць і вылучыць асаблівасці яго сучаснага і мінулага стану. Акрамя таго, адсутнічаюць комплексныя даследаванні станаўлення і развіцця курса "Бібліятэчныя фонды" ў некалькіх краінах адначасова, у тым ліку ў Расіі і Беларусі.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца пераасэнсаванне з пазіцый сучаснасці асноўных этапаў станаўлення і развіцця курса "Бібліятэчныя фонды" як дысцыпліны, выкладаемай у ВНУ ў межах былога Савецкага Саюза, незалежных Расіі і Беларусі. Атрыманыя вынікі даюць магчымасць вызначыць напрамкі далейшага развіцця і ўдасканалення курса "Бібліятэчныя фонды" як у Расіі, так і ў Беларусі.

Курс "Бібліятэчныя фонды" прайшоў доўгі і складаны шлях станаўлення. Вытокі яго развіцця як прадмета выкладання прасочваюцца ў пачатку XX ст., калі ўзнікла праблема падрыхтоўкі кадраў для бібліятэк і з'явіліся першыя падручнікі і дапаможнікі па бібліятэчнай справе. У той час у Расійскай дзяржаве не было ўстаноў, якія займаліся падрыхтоўкай бібліятэчных кадраў. Існавалі толькі бібліятэчныя курсы пры Маскоўскім народным універсітэце імя А.Л.Шаняўскага. Першым дапаможнікам па бібліятэчнай справе стала кніга Л.Б.Хаўкінай "Библиотеки, их организация и техника" (1904). У кнізе з ліку пытанняў, якія складаюць сучасны курс "Бібліятэчныя фонды", разглядаліся пытанні ўліку, расстаноўкі і захавання фондаў і не закраналіся пытанні іх камплектавання. Але другое выданне гэтай кнігі (1911) [23] утрымлівала главу, якая была прысвечана пытанням камплектавання бібліятэчнага фонду. Аднак яна не змяшчала значных тэарэтычных высноў і мела практычны характар: рэкамендаваліся бібліяграфічныя дапаможнікі ў дапамогу камплектаванню, даваліся агляд сусветнай друкаванай прадукцыі і пералік рускіх кнігагандлёвых фірмаў. Акрамя таго, у кнізе падкрэслівалася, што галоўнае ў камплектаванні – адбор літаратуры. Вылучэнне працэсу адбору дакументаў адбылося пад уплывам на пазіцыі Л.Б.Хаўкінай поглядаў М.А.Рубакіна – заснавальніка тэорыі адбору літаратуры ў рускім бібліятэказнаўстве. Заслуга М.А.Рубакіна і яго паслядоўнікаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заключаецца ў тым, што пытанні камплектавання яны разглядалі не толькі як набыццё, але і, у першую чаргу, як адбор кніг. Аднак у дарэвалюцыйны перыяд поруч з новым кірункам распрацоўкі пытанняў камплектавання фондаў бібліятэк, звязаным з тэорыяй адбору, працягваў развівацца і вузкатэхнічны кірунак. Дадзеныя кірункі знайшлі адлюстраванне ў праграмах курсаў па бібліятэчнай справе. Ужо ў першай праграме на 1913/14 навучальны год прадугледжвалася вывучэнне двух раздзелаў: адзін тычыўся пытанняў выкарыстання бібліяграфічных дапаможнікаў пры камплектаванні бібліятэк ("Практическая библиография и комплектование библиотек"), другі – тэхнікі набыцця кніг у кнігавыдавецкіх установах ("Приобретение книг. Книгоиздательские фирмы России"). Усе тэмы гэтых раздзелаў паміж сабой не былі звязаны, змест іх меў тэарэтыка-практычны характар [5].

Дзякуючы ідэям М.А.Рубакіна пачалася распрацоўка пытанняў тэорыі камплектавання бібліятэчных фондаў. Яго вучэнне аб адборы склала аснову тэорыі камплектавання. Трэба адзначыць, што тэорыя камплектавання ў гэты час развівалася ў цеснай сувязі з тэорыяй бібліяграфіі.

Такім чынам, курс "Бібліятэчныя фонды" зарадзіўся яшчэ ў пачатку XX ст., калі намеціліся асноўныя тэндэнцыі камплектавання фондаў, тэхналогіі арганізацыі бібліятэк і выкарыстання дакументаў. Курсы пры Маскоўскім народным універсітэце імя А.Л.Шаняўскага вызначылі кірункі агульнатэарэтычнага і вузка практычнага фарміравання дысцыпліны. Гэтыя шляхі развіцця курса абумоўлівала мноства поглядаў на дакументны масіў бібліятэказнаўцаў пачатку XX ст.: М.А.Рубакіна, Л.Б.Хаўкінай, В.М.Дзянісьева, К.М.Дзерунова, К.І.Рубінскага.

У 1930-я гг. тэорыя адбору, як і ў папярэднія гады, разглядалася як аснова навуковай пастаноўкі камплектавання фонду. У сувязі з гэтым увага надавалася бібліяграфічным выданням у дапамогу камплектаванню. Адпаведна ў гэтыя гады канчаткова склалася разуменне таго, што выкладанне пытанняў камплектавання павінна грунтавацца на добрым веданні студэнтамі агульнай і галіновай бібліяграфіі. В.М.Дзянісьеў падрыхтаваў курс "Комплектование библиотек", у структуры якога вылучаліся наступныя раздзелы: "Библиографические указатели русской литературы", "Библиографические указатели иностранной литературы", "Техника книгопечатания", "Книгоиздательство в СССР", "Книгоиздательство за границей", "Русская периодика (история и современное состояние)", "Методика изучения книги и комплектование библиотек" [20]. Такая структура яўна дэманструе сувязь пытанняў камплектавання бібліятэк і методыкі вывучэння кнігі, а таксама шырокае прадстаўленне бібліяграфіі і кнігазнаўства.

В.М.Дзянісьеў арыентаваў свой курс на падрыхтоўку работнікаў масавых бібліятэк. Практычныя дапаможнікі В.М.Дзянісьева па камплектаванні былі аднačасова і першымі падручнікамі. У 1936 г. быў выдадзены яго дапаможнік "Комплектование книжных фондов массовых библиотек (организация и методы)". Другое, дапоўненае выданне дапаможніка выйшла ў 1939 г. пад назвай "Комплектование библиотечного фонда" [8]. У гэтым жа годзе Дзянісьеў распрацаваў праграму курса "Комплектование библиотечного фонда" [9]. У праграму былі ўключаны толькі пытанні камплектавання фонду. Астатнія пытанні работы з фондам, а менавіта пытанні арганізацыі фонду, увайшлі ў курс "Фонды и каталоги библиотек" (праграма была распрацавана Л.У.Трафімавым, Ю.У.Грыгор'евым і З.М.Амбарцумянам). Гэта абумоўлівалася тым, што пытанні арганізацыі (улік, размяшчэнне, расстаноўка) бібліятэчнага фонду ў дарэвалюцыйны перыяд і ў 1920-я гг. звязваліся з пытаннямі каталагізацыі. Да іх далучаліся пытанні захаванасці фондаў.

Такім чынам, у апошнія перадваенныя гады змест курса "Бібліятэчныя фонды" быў разгрупаваны ў двух курсах: "Камплектаванне бібліятэчных фондаў" і "Фонды і каталогі бібліятэк". Больш таго, змест курса "Камплектаванне бібліятэчных фондаў" быў цесна звязаны з пытаннямі бібліяграфічных выданняў, а курса "Фонды і каталогі бібліятэк" – з пытаннямі каталагізацыі дакументаў. Дадзеныя курсы развіваліся самастойна і не звязваліся адзін з адным.

У працэсе выкладання ў гады Вялікай Айчыннай вайны курс "Фонды і каталогі бібліятэк" раздзяліўся. З яго вылучыўся курс "Арганізацыя бібліятэчных фондаў". Тым не менш да сярэдзіны XX ст. пытанні арганізацыі бібліятэчных фондаў звязваліся з пытаннямі каталагізацыі дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як адзіная дысцыпліна курс “Бібліятэчныя фонды” ўзнік у 1950 г. Яго аўтарамі былі Ю.У.Грыгор’еў і А.С.Чубар’ян. Курс уваходзіў у праграму па бібліятэказнаўстве на 1950/51 навучальны год.

А.С.Чубар’ян увёў раздзел аб паняційным апараце дысцыпліны, распрацаваў новыя тэмы, у тым ліку тэмы, якія маюць агульнае значэнне для пытанняў камплектавання і арганізацыі фондаў.

Ю.У.Грыгор’еў на працягу многіх гадоў распрацоўваў пытанні ўліку, расстаноўкі і захавання бібліятэчных фондаў. Ён увёў новае абагульняючае паняцце “арганізацыя бібліятэчных фондаў”. Новае паняцце было замацавана ў вучэбным дапаможніку Ю.У.Грыгор’ева “Организация библиотечных фондов” (1953) [6].

У 1954 г. курс “Бібліятэчныя фонды” быў аб'яднаны з курсам “Бібліятэчныя каталогі” пад агульнай назвай “Бібліятэчныя фонды і каталогі”. Такое становішча заставалася да 1965 г. Трэба адзначыць, што працяглае існаванне пад адной назвай дзвюх асобных дысцыплін не прывяло да іх аб’яднання і ўтварэння аднаго курса, а наадварот, тармазіла развіццё абедзвюх.

Вучэбны план 1965 г. і праграма па бібліятэказнаўстве раздзялілі гэтыя курсы. Курс “Бібліятэчныя фонды” стаў адносна самастойным сярод іншых бібліятэказнаўчых дысцыплін.

У 1967 г. выходзіць вучэбны дапаможнік “Библиотечные фонды” [1], у якім зроблена спроба выявіць агульныя для камплектавання і арганізацыі фондаў тэарэтычныя пытанні.

У 1970-я гг. работа над курсам ішла пераважна ў кірунку ўзмацнення яго агульнатэарэтычнай часткі, імкліва развіваліся новыя паняцці, звязаныя з бібліятэчным фондам. Значную ролю ў гэтым адыгрываў Ю.У.Грыгор’еў. Ён лічыў, што вучэбны курс можа развівацца толькі на аснове трывалых навуковых дасягненняў у галіне бібліятэчных фондаў. Гэта дазваляе зрабіць вывад, што бібліятэчнае фондазнаўства і курс развіваліся ва ўзаемасувязі.

Ю.У.Грыгор’еў прасунуў тэарэтычную распрацоўку курса “Бібліятэчныя фонды” як інтэграванага курса, узняў агульнафондавыя праблемы, паклаў пачатак новым паняццям, такім як “фарміраванне бібліятэчных фондаў”, “другасны адбор” і інш. Дзякуючы намаганням Ю.У.Грыгор’ева склалася лагічная структура курса, якая ахапіла ўсе важнейшыя тэхналагічныя працэсы стварэння бібліятэчнага фонду. Яго апошняя праца “Теоретические основы формирования библиотечных фондов” (1973) з’яўляецца прыметнай падзеяй у бібліятэказнаўстве [10].

Далейшая распрацоўка агульнатэарэтычных пытанняў знайшла адлюстраванне ў новым выданні падручніка “Библиотечные фонды” (1979) [2]. У яго ўключаны, напрыклад, такія паняцці: “бібліятэчны фонд як сістэма”, “уласцівасці бібліятэчнага фонду”, “фарміраванне бібліятэчнага фонду”, “паўната бібліятэчнага фонду”. Значна ўзняты тэарэтычны ўзровень раздзела “Арганізацыя бібліятэчных фондаў”. Узмоцнены тэарэтычны бок традыцыйных для курса тэм: улік фонду, размяшчэнне і расстаноўка фонду, захаванасць фонду.

У 1972 г. выходзіць вучэбны дапаможнік знакамітага беларускага бібліятэказнаўца М.І.Пакала “Библиотечные фонды Белорусской ССР”. У ім раскрываюцца пытанні гісторыі, стану методыкі і арганізацыі камплектавання, уліку і расстаноўкі фондаў бібліятэк Беларускай ССР, абумоўленыя сацыяльна-эканамічнымі, гістарычнымі і культурнымі асаблівасцямі яе развіцця. Фарміраванне фондаў разглядаецца ў дапаможніку ва ўзаемасувязі з развіццём бібліятэчнай сеткі [13].

Важным дасягненнем у галіне выкладання курса ў 1970-я гг. неабходна лічыць больш высокі ўзровень абагульнення практыкі работы бібліятэк розных тыпаў і відаў. Калі раней курс быў нацэлены на адлюстраванне і абагульненне вопыту масавых бібліятэк, то цяпер ён шырока асвятляў вопыт работы і навуковых бібліятэк.

Далейшае развіццё курса “Бібліятэчныя фонды” будзе звязана перш за ўсё з распрацоўкай і паглыбленнем агульных палажэнняў, уласцівых фондам бібліятэк усіх тыпаў і відаў.

Апошнім падручнікам па курсу “Бібліятэчныя фонды”, які выйшаў у Савецкім Саюзе, быў падручнік Ю.М.Сталярова “Библиотечный фонд” (1991), дзе дасканала раскрыты тэарэтычныя пытанні фарміравання бібліятэчнага фонду. У ім упершыню прадстаўлены

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўвесь цыкл тэхналогіі фарміравання бібліятэчнага фонду, які складаецца з мадэліравання, камплектавання, уліку і апрацоўкі, размяшчэння і расстаноўкі, захавання і дастаўкі дакументаў бібліятэчнага фонду [14].

Такім чынам, курс “Бібліятэчныя фонды” сфарміраваўся ў вучэбную і навуковую дысцыпліну ў савецкія гады. Бібліятэчны фонд – аснова дзейнасці любой бібліятэкі, і практычны вопыт па рабоце з дакументамі знаходзіў адлюстраванне ў гэтым курсе.

У 1992 г. выходзіць падручнік К.Л.Варанько “Библиотечные фонды”. Падручнік прызначаны для падрыхтоўкі студэнтаў бібліятэчных тэхнікумаў і бібліятэчных аддзяленняў культурна-асветных вучылішчаў [4]. У 1994 і 2000 гг. У.І.Цярошын выдае вучэбны дапаможнік “Библиотечный фонд”, прызначаны для выкарыстання ў падрыхтоўцы студэнтаў бібліятэчных каледжаў, вучылішчаў культуры і мастацтваў, а таксама для выкарыстання работнікамі бібліятэк розных тыпаў і відаў [22]. Паколькі галоўнай мэтай курса “Бібліятэчныя фонды” ў гэтых установах з’яўляецца падрыхтоўка спецыяліста, які працуе непасрэдна з фондам, вялікая ўвага ў выданнях нададзена выпрацоўцы навыкаў і ўменняў у ажыццяўленні тэхналагічных працэсаў фарміравання бібліятэчнага фонду. Курс арыентаваны на падрыхтоўку спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі і таму ўвабраў у сябе ўвесь навуковы і практычны патэнцыял у галіне бібліятэчнага фондазнаўства.

З сярэдзіны 1990-х гг. стала зразумела, што пытанням, звязаным з захаванасцю бібліятэчнага фонду, уласціва спецыфіка, якая выходзіць за межы цыкла тэхналогіі фарміравання фонду. Яшчэ не апрацаваны або часткова апрацаваны фонд захоўваюць як у працэсе яго фарміравання, так і пасля завяршэння цыкла фарміравання. Гэта прывяло да прапановы навукоўцаў кафедры дакументных рэсурсаў і дакументацыйнага забеспячэння кіравання Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў аб выдзяленні з курса “Бібліятэчныя фонды” самастойнага вучэбнага курса “Захаванне бібліятэчных фондаў”, які належыць уключыць у дзяржаўныя адукацыйныя стандарты і адпаведныя вучэбныя планы [15].

У 1995 г. выходзіць вучэбна-метадычны дапаможнік Ю.М.Сталярова “Как сохранить библиотечные фонды”. Павышаны попыт на яго прывёў да выдання ў 2001 г. другога, дапрацаванага і дапоўненага выдання “Как сохранить библиотечный фонд” [18]. У дапаможніку раскрываюцца пытанні забеспячэння захаванасці бібліятэчнага фонду ў працэсе яго ўліку, апрацоўкі, захавання і выкарыстання; прававыя, сацыяльныя і тэхналагічныя фактары абароны фонду ад проціпраўных дзеянняў чытачоў і бібліятэкараў, ад неспрыяльных экалагічных, тэхнагенных і іншых уздзеянняў.

З самага пачатку XX ст. курс “Бібліятэчныя фонды” развіваецца з улікам рэалій сучаснасці. У ім знаходзяць адлюстраванне як распрацоўка і ўдакладненне агульных і прыватных тэарэтычных асноў бібліятэчнага фонду, так і вызначэнне месца электронных дакументаў у бібліятэчным фондзе, праблемы фарміравання размеркаванага бібліятэчнага фонду, сістэмы дакументазабеспячэння, захавання і бяспекі бібліятэчнага фонду і інш.

У 2001 г. выдадзены вучэбны дапаможнік Ю.М.Сталярова “Документный ресурс” [16]. У ім аўтар прыводзіць уласнае азначэнне тэрміна “дакументны рэсурс”, паказвае яго суадносіны з тэрмінам “бібліятэчны фонд”, раскрывае сістэму сувязей бібліятэчнага фонду і фондаў іншых дакументальных сістэм: архіваў, музеяў, выстаў, дакументавыдавецкіх і дакументагандлёвых арганізацый, органаў навукова-тэхнічнай інфармацыі. У гэты ж перыяд Ю.А.Грыханаў сфармуляваў “закон метамарфізму бібліятэкі”: бібліятэка “периодически трансформирует или видоизменяет формы комплектования, хранения и предоставления пользователям документной информации параллельно с развитием технологий записи, хранения и передачи данных, а также средств коммуникации” [7, с. 562]. Аналіз такой фармулёўкі, а таксама разважанняў і сцвярджэнняў аўтара дае падставу адзначыць, што гэты закон мае прамыя адносіны да бібліятэчнага фонду і таму ўяўляецца больш карэктнай яго назва як “закон метамарфізму бібліятэчнага фонду”. Закон Ю.А.Грыханава з’яўляецца першым фундаментальным палажэннем у бібліятэчным фондазнаўстве пачатку XXI ст.

Важная задача на сучасным этапе – тэарэтычнае асэнсаванне феномена электроннага дакумента як элемента бібліятэчнага фонду. Нягледзячы на актуальнасць, праблема

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

электронных дакументаў у прафесійнай літаратуры Беларусі і іншых краін былога Савецкага Саюза яшчэ распрацавана недастаткова. Манаграфія Т.В.Майстровіч “Электронный документ как объект библиотечного дела” з’явілася толькі ў 2004 г. [12]. Манаграфія прысвечана тэорыі і практыцы фарміравання фондаў электронных дакументаў. Зыходзячы з водгукаў Ю.М.Сталярова [19], Н.М.Літвінавай [11], В.А.Барысавай [3] у манаграфіі шэраг пытанняў уяўляюцца спрэчнымі і нявырашанымі. Тым не меней у ёй даюцца аргументаваныя адказы на пытанні аб тым, ці правамерна бібліятэцы працаваць з электронным дакументам, ці мяняе ён статус бібліятэчнага фонду ў структуры бібліятэкі, што, у сваю чаргу, дазваляе гаварыць аб навуковай значнасці работы.

Павышэнне актуальнасці праблемы абароны бібліятэчных фондаў ад неспрыяльных уздзеянняў прывяло Ю.М.Сталярова да выдання ў 2006 г. новага вучэбнага дапаможніка “Защита библиотечного фонда” [17]. У дапаможніку Ю.М.Сталяроў упершыню зрабіў спробу комплекснага падыходу да пытанняў агульнадзяржаўнай абароны фондаў бібліятэк: стварэння дэпазітарнай і рэпазітарнай сістэм захавання, страхавога фонду, рэалізацыі праграмы “Память России”, захавання кніжных помнікаў. Аўтар разглядзеў таксама меры сацыяльнай, эканамічнай, фінансавай, юрыдычнай, тэхналагічнай, тэхнічнай і іншых відаў абароны бібліятэчных фондаў.

Такім чынам, курс “Бібліятэчныя фонды” з’яўляецца адной з важнейшых спецыяльных дысцыплін. Вывучэнне студэнтамі заканамернасцей развіцця і функцыянавання фондаў дазваляе не толькі набыць веды аб фондавых праблемах, але і ўзбагаціць уяўленне аб бібліятэцы ў цэлым, паглыбіць і пашырыць разуменне пытанняў абслугоўвання карыстальнікаў. У цяперашні час курс патрабуе тэарэтычнага і практычнага ўдасканалення. Новы падручнік па курсу “Бібліятэчныя фонды” пакуль што адсутнічае, але праца па яго стварэнні вядзецца вядучымі спецыялістамі-фондазнаўцамі.

1. *Библиотечные* фонды: учебник / под ред. Ю.В.Григорьева. – М.: Просвещение, 1967. – 203 с.

2. *Библиотечные* фонды: учебник / под ред. Ю.Н.Столярова и Е.П.Арефьевой. – М.: Книга, 1979. – 296 с.

3. *Борисова, О.О.* Новый шаг к созданию системы знаний об электронном документе / О.О.Борисова, Я.В.Радищевский // Библиотековедение. – 2005. – № 5. – С. 126–130.

4. *Воронько, К.Л.* Библиотечные фонды: учебник / К.Л.Воронько. – М.: Кн. палата, 1992. – 197, [3]с.

5. *Василенко, В.И.* Становление вузовского курса “Библиотечные фонды” / В.И.Василенко // Современные тенденции в развитии фондов советских библиотек: межвуз. сб. науч. тр. / Моск. гос. ин-т культуры. – М.: [МГИК], 1979. – С. 141–154.

6. *Григорьев, Ю.В.* Организация библиотечных фондов: [учеб. пособие] / Ю.В.Григорьев; под. ред. А.В.Усова; М-во культуры РСФСР, Моск. гос. библ. ин-т им. В.М.Молотова. – М.: Гос. изд-во культ.-просвет. л-ры, 1953. – 263 с.

7. *Гриханов, Ю.А.* Метаморфизм библиотеки и структурная реорганизация библиотечных фондов / Ю.А.Гриханов // Библиотеки и ассоциации в меняющемся мире: новые технологии и новые формы сотрудничества: Восьмая Междунар. конф. “Крым-2001”, Судак, 9–17 июня 2001 г.: тр.: [в 3 т.] / ГПНТБ России. – М.: ГПНТБ России, 2001. – Т. 2. – С. 561–564.

8. *Денисьев, В.Н.* Комплектование библиотечного фонда: пособие для массовых библиотек / В.Н.Денисьев; отв. ред. Е.В.Сеглин; НИИ библиотековед. и рек. библиогр. – М.: [Б.и.], 1939. – 161 с.

9. *Денисьев, В.Н.* Программа по курсу “Комплектование библиотечных фондов” / В.Н.Денисьев // Программы по специальным дисциплинам на 1939/40 учебный год / Моск. гос. библ. ин-т. – М.: [МГБИ], 1939. – Вып. 1. – С. 159–165.

10. *Каширин, Ю.В.* Роль Ю.В.Григорьева в становлении и развитии учебного курса “Библиотечный фонд”. К 100-летию Ю.В.Григорьева [Электронный ресурс] / Ю.В.Каширин // Науч. и техн. б-ки. – Электрон. дан. – 1999. – № 12. – Режим доступа: http://www.gpntb.ru/win/ntb/ ntb99/12/12_06. html.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*11. Литвинова, Н.Н.* Еще раз об электронном документе (Размышления по поводу монографии Т.В.Майстрович “Электронный документ как объект библиотечного дела”) / Н.Н.Литвинова // Науч. и техн. б-ки. – 2005. – № 11. – С. 57–62.

*12. Майстрович, Т. В.* Электронный документ как объект библиотечного дела / Т.В.Майстрович. – М.: Пашков дом, 2004. – 247 с.

*13. Покало, М.И.* Библиотечные фонды Белорусской ССР: [пособие для студ. библ. фак. вузов] / М.И. Покало. – Мн.: Вышэйш. шк., 1972. – 84, [2] с.

*14. Столяров, Ю.Н.* Библиотечный фонд: учебник / Ю.Н.Столяров. – М.: Кн. палата, 1991. – 270 с.

*15. Столяров, Ю.Н.* Вузовский курс “Библиотечный фонд”: новый этап развития / Ю.Н.Столяров // Библиотечное дело – 2004: всеобщая доступность информации: материалы Девятой Междунар. науч. конф. (Москва, 22–24 апр. 2004 г.) / Моск. гос. ун-т культуры и искусств, каф. библиотековедения. – М.: [МГУКИ], 2004. – С. 270–271.

*16. Столяров, Ю.Н.* Документный ресурс: учеб. пособие / Ю.Н.Столяров. – М.: Либерея, 2001. – 152 с.

*17. Столяров, Ю.Н.* Защита библиотечного фонда: учеб. пособие / Ю.Н.Столяров. – М.: Фаир-Пресс, 2006. – 504 с. – (Специальный издательский проект для библиотек).

*18. Столяров, Ю.Н.* Как сохранить библиотечный фонд: [секреты старого книгохранителя]: учеб-метод. пособие / Ю.Н.Столяров; Моск. гос. ун-т культуры и искусств. – 2-е изд., дораб. и доп. – М.: ИПО “Профиздат”: МГУКИ, 2001. – 254 с. – (Сер. “Современная библиотека”; вып. 9).

*19. Столяров, Ю.Н.* Развитие электронного фондоведения [Электронный ресурс] / Ю.Н.Столяров // Библиотеки и информационные ресурсы в современном мире науки, культуры, образования и бизнеса: 12-я Междунар. конф. “Крым-2005”, Судак, 4–12 июня 2005 г.: материалы конф. / ГПНТБ России. – Электрон. дан. – М.: ГПНТБ России, 2005. – Режим доступа: http://www.gpntb.ru/win/inter-events/crimea2005/disk/59.pdf.

*20. Столяров, Ю.Н.* Становление вузовского курса “Библиотечный фонд” [Электронный ресурс] / Ю.Н.Столяров // Библиотеки и информационные ресурсы в современном мире науки, культуры, образования и бизнеса: 11-я Междунар. конф. “Крым-2004”, Судак, 5–13 июня 2004 г.: материалы конф. / ГПНТБ России. – Электрон. дан. – М.: ГПНТБ России, 2004. – Режим доступа: http://www.gpntb.ru/win/inter-events/crimea2004/disk/doc /311.pdf.

*21. Терёшин, В.И.* Библиотечное фондоведение: современное состояние, проблемы / В.И.Терёшин // Науч. и техн. б-ки СССР. – 1982. – № 3. – С. 3–12.

*22. Терёшин, В.И.* Библиотечный фонд: учеб. пособие / В.И.Терёшин. – Изд. 2-е, испр. и доп. – М.: МГУКИ: ИПО “Профиздат”, 2000. – 172, [2]с. – (Сер. “Современная библиотека”; вып. 4).

*23. Хавкина, Л.Б.* Библиотеки, их организация и техника: рук-во по библиотековедению / Л.Б.Хавкина. – 2-е перераб. и знач. доп. изд. – СПб.: [б.и.], 1911. – VIII, 404 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ